# НЕ ІГРАЮЦЬ, А ЖЫВУЦЬ

**У гарадской бібліятэцы-філіяле №1 адбылася літаратурна-краязнаўчая гасцёўня "ІванМележ-абраннік Палесся"**



Беларуская зямля нарадзіла шмат вядомых культурных дзеячаў, сярод якіх - паэты і празаікі. Для шматлікіх з іх гэты год стаў юбілейным. А наша Гомельшчына ў гэтым годзе святкуе два юбілеі двух таленавітых Іванаў, двух народных пісьменнікаў Беларусі - Івана Шамякіна і Івана Мележа. Гасціная будзе прысвечана менавіта аднаму з іх - Івану Паўлавічу Мележу.

На гэты раз гасцямі бібліятэкі сталі паэтэса **Галіна Мікалаеўна Дашкевіч** і артыстка тэатра **Зінаіда Віктараўна Нагорная.** Што іх аб'ядноўвае? Ды тое, што ім давялося разам іграць у спектаклі "Людзі на балоце", які быў пастаўлены ў Мазыры 22 красавіка 1970 года рэжысёрам Міхаілам Коласам. Зінаіда Віктараўна іграла маці Васіля, а Галіна Мікалаеўна-Хадоську. На прэм'еры прысутнічаў і сам Іван Мележ. "Вы не іграеце, вы жывяце", - так сказаў пісьменнік пасля прагляду, а гэта вышэйшая адзнака для артыстаў. Галіна Мікалаеўна паказала гімназістам рэдкія фотаздымкі, дзе адлюстраваны сцэны са спектакля і дзе акцёры сфатаграфаваны разам з Іванам Паўлавічам, а таксама расказала аб тым, як адзначалася сёлета яго 95-годдзе ў Глінішчах - на радзіме пісьменніка. Зінаіда Віктараўна падзялілася сваімі ўспамінамі (у гэтым спектакпі ўдзельнічалі і яе дзеці) і прынесла на сустрэчу кніжку "Людзі на балоце" з аўтографам народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа.

**Таццяна БЕРДНІК, бібліятэкар 1 катэгорыі бібліятэкі-філіяла №1.**

Бердник, Т. Не іграюць, а жывуць / Таццяна Берднік // Жыццё Палесся. – 2016. – 24 марта. – С. 5